ганов внутренних дел. Овладение этими знаниями позволяет сотрудникам ОВД правильно применить правовую норму в сугубо индивидуальных, неповторимых ситуациях. А это и есть проявление высокого уровня профессиональной культуры сотрудника органов внутренних дел.

**І.А.Алексніна,** *кандыдат мастацтвазнаўства,ст.выкладчык*

# ДА ПРАБЛЕМЫ РЭЖЫСЁРСКАГА ПЕРАЎВАСАБЛЕННЯ

Авалоданне майстэрствам рэжысёрскага пераўвасаблення – адна з частак самастойнай работы студэнта ў працэсе падрыхтоўкі спектакля, якая мала вывучана ў тэорыі і практыцы рэжысуры, а таксама і тэатральнай педагогіцы.

У сучасным беларускім тэатразнаўстве гэта праблема пакуль што не знайшла свайго даследчыка, у той час як рускія тэарэтыкі і практыкі тэатра ўжо зрабілі першыя спробы да яе навуковага асэнсавання. Нас цікавіць самая скрытая, але і самая значная частка работы рэжысёра над спектаклем — творчае "ўжыванне" ў свет п'есы, яе аналіз і спасціжэнне "прыроды пачуццяў" драматычнага твора. Зрабіць гэта немагчыма без рэжысёрскага пераўвасаблення ў аўтара.

Даследчык В.П.Фунтусаў прапаноўвае вылучаць тры асноўныя, прынцыпова розныя формы праяўлення рэжысёрскага пераўвасаблення: 1) ужыванне, 2) адчужэнне, 3) мастацкі эксперымент (гл. Фунтусов В.П. Мастерство режиссёра: режиссёрское перевоплощение: Учеб. пособие. – СПб., 1999. – С. 14–17). Аднак пры самастойнай рабоце над п'есай перавагай карыстаюцца першая і другая формы, апошняя ж сустракаецца толькі ў назіранні жыцця і ў рэпетыцыях з акцёрамі, таму звернем ўвагу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на ўжыванне і адчужэнне, якімі павінны авалодаць студэнты 3-га курса на першым этапе работы з п'есай. Вучэбная праграма абмяжоўвае работу студэнтаў 3-га курса пастаноўкай урыўка з п'есы, але гэта не выключае неабходнасці авалодання навыкамі рэжысёрскага аналізу ўсяго твора. Для таго каб выбраць эпізод для пастановачнай работы і добра яго прааналізаваць, трэба ведаць, якое месца займае выбраная сцэна ў агульнай кампазіцыі п'есы, якія абставіны прапануюцца аўтарам, якая падзея адбываецца, вакол чаго завязваецца канфлікт, як прадстаўлены характары дзеючых асоб і інш.

Ужыванне – самая распаўсюджаная і самая вывучаная форма пераўвасабляемасці. Яна складае галоўны змест працэсу пераўвасаблення акцёра і таму нярэдка атаясамляецца з ім. Ужыванне ў працэсе пераўвасаблення дазваляе рэжысёру пранікнуць у аб'ект назірання, зліцца з ім і пераўтварыцца ў гэты аб'ект.

Адчужэнне – больш складаная форма праяўлення пераўвасаблення. Адчужэнне – гэта не што іншае, як «ужыванне наадварот»: «...калі пры ўжыванні мы пранікаем у саму з'яву, то пры адчужэнні мы пранікаем у нейкі іншы пункт гледжання, ужываемся ў яго, і менавіта гэта змяняе нашы адносіны да з'явы. У аснове любога прыёму адчужэння ляжыць менавіта гэтая часовая перабудова асобы мастака-рэжысёра, якая грунтуецца на прынцыпах пераўвасаблення».

Звернем увагу на самую складаную задачу – вывучэнне аўтарскага стылю і жанру. Паспрабуем разгледзець гэты працэс з выкарыстаннем тэорыі рэжысёрскага пераўвасаблення, прапанаванай В.П.Фунтусавым.

Першым крокам з'яўляюцца вывучэнне аўтарскай пунктуацыі і спецыфікі расстаноўкі знакаў прыпынку; сістэматызацыя займеннікаў, прыслоўяў, прыназоўнікаў; даследаванне агульнай структуры сказаў, якая выкарыстоўваецца аўтарам, а таксама вызначэнне логікі аўтара праз пабудову сказаў і іх кампазіцыю. Тут мае месца хутчэй літаратурны, тэатразнаўчы аналіз, а па форме рэжысёрскага пераўвасаблення – адчужэнне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Другім крокам у гэтым напрамку будуць тлумачэнне неабходнасці рэмарак і магчымасці іх выкарыстання, а таксама аналіз маналогаў, дыялогаў і тэмпарытму мовы. Тут ужо гаворка можа ісці аб межаванні як рэжысёрскага адчужэння, так і ўжывання.

Усё, што робіць рэжысёр далей на шляху спасціжэння асаблівасцей аўтарскага стылю і жанру, можна ахарактарызаваць як цесны сплаў і ўжывання, і адчужэння: а) адчуць «прыроду» дзеючых асоб і іх пачуццяў, зразумець адносіны аўтара да ўсяго, што адбываецца ў п’есе і да кожнага героя паасобку; б) прааналізаваць прапанаваныя абставіны, якія выкарыстоўваліся драматургам; в) распрацаваць вобразы п’есы (гістарычны і культурны час, месца пражывання героя, падзеі, якія аказваюць уплыў на яго фарміраванне і развіццё, сацыяльнае асяроддзе, нацыянальная і класавая прыналежнасць, прафесія, паводзіны, манеры, жэстыкуляцыя, міміка, рух, погляды, манера весці размову, пачуцці, думкі (тайныя і яўныя), узаемадзеянне з іншымі асобамі; «самаатэстацыя» і характарыстыка гэтай асобы іншымі героямі, аўтарам і інш.).

Неабходна падкрэсліць, што рэжысёрскае пераўвасабленне мае вельмі важную ролю ў працэсе работы рэжысёра над спектаклем і асабліва ў працэсе самастойнай распрацоўкі рэжысёрска-пастановачнага плана і падрыхтоўкі да работы з акцёрам. Яно патрабуе ўважлівага навуковага вывучэння, асэнсавання і стварэння тэарэтыка-метадычных распрацовак, якія былі б карыснымі як для выкладчыкаў рэжысуры, так і для студэнтаў – будучых рэжысёраў і тэатральных педагогаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ